Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

За сталінскія кадры

Орган партбюро, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 23 (209)
Серада
1
снежня
1954 г.

Цана 20 кап.

НАСУТНАЯ ЗАДАЧА НАСЦЕННАГА ДРУКУ

Факультэцкія і аддзяленчаскія насценныя газеты з'яўляюцца дзейснымі памочнікамі дэканатаў, партыйных, комсамольскіх і прафсаюзных арганізацый у барацьбе за глыбокія веды студэнтаў, за выхаванне ў маладых людзей высокіх маральных і дзелавых якасцей. Іх пачэсны абавязак—усебакова адлюстроўваць жыццё і паўсядзённыя справы універсітэцкага калектыву, мабілізоўваць студэнтаў на барацьбу за ўпорнае і настойлівае авалодванне асновамі перадавой совецкай навукі.

Семінарскія і практычныя заняткі, напісанне і абарона курсавых і дыпломных работ, выкананне вучэбных планаў, г. зн. увесь ход вучэбнага працэсу ні на хвіліну не павінен выпадаць з-пад іх увагі.

Трэба прызнаць, што ў бягучым навучальным годзе, у параўнанні з мінулым, насценныя газеты універсітэта ў значнай ступені страцілі свой баявы дух і вастрыню выступленняў. Насценгазеты запаўняюцца малазмястоўнымі заметкамі, часта вельмі далёкімі ад вучобы студэнтаў. Замест аналізу недахопаў у правядзенні семінараў і практычных заняткаў, замест дзелавой і прынцыповай крытыкі парушальнікаў вучэбнай і працоўнай дысцыпліны, газеты абмяжоўваюцца агульнымі разважаннямі і не нацэльваюць на ліквідацыю маючыхся недахопаў.

Насценныя газеты выходзяць ад выпадку да выпадку, афармляюцца без мінімальнага мастацкага густу.

Усё гэта датычыцца не толькі газет «Даследчык» (геолага-геаграфічны факультэт) і «Студэнт гістфака», якія ўжо даўно адрозніваюцца вузасцю тэматыкі і навярхоўнасцю сваіх выступленняў, але і лепшых нашых газет «За перадавую навуку» (аддзяленне журналістыкі) і «Совецкі хімік».

Нягледзячы на тое, што ўжо даўно поўным ходам ідуць семінарскія і практычныя заняткі, толькі некаторыя з насценгазет змясцілі матэрыялы на такія тэмы. Ды і то гэта толькі інфармацыйныя заметкі, без аналізу недахопаў і станоўчых момантаў у падрыхтоўцы і правядзенні семінараў. Мала таго, газета «Даследчык» наогул не разумее сутнасці семінараў і, магчыма, таму сцвярджае на сваіх старонках, што «ісціна нараджаецца ў спрэчках—у гэтым сутнасць семінарскіх заняткаў»(?!).

Замест сістэматычнага асвятлення вучобы студэнтаў газета «За перадавую навуку» значную частку аднаго з апошніх нумароў адвяла раздзелу «Сяброўскія шаржы і прэтэнзіі», які запоўнен фантастычнымі рэпартажамі аб сустрэчах студэнтаў, будучых журналістаў у 197... годзе пасля ўдалых палётаў вакол зямнога шару на «рэактыўных снарадах» і здачы ў набор інфармацыі аб пуску на Марсе першага металургічнага камбіната.

Членам рэдакцыі гэтай газеты даўно пара прыступіць да сур'ёзнага асвятлення вучобы студэнтаў, а не лунаць у воблаках, не аддавацца фантастычным ілюзіям. на якія, дарэчы, у рэдакцыі таксама не хапае ні густу, ні гумару, ні элементарнага ўмення.

Газета «Совецкі хімік» большую палову сваёй газетнай паласы адвяла дыскусіі «У чым прыгажосць чалавека?..» Мы не супроць гэтай дыскусіі, якая безумоўна прынясе вялікую карысць у барацьбе газеты за высокую культуру. Але трэба ведаць меру і не забывацца аб галоўным—аб вучобе і дысцыпліне студэнтаў.

Матэрыяламі агульна-папулярызатарскага плана запаўняюцца старонкі газеты «За навуку» (фізіка-матэматычны факультэт). Гэтая газета наогул абыходзіць маўчаннем пытанні вучобы.

Набліжаецца зімовая экзаменацыйная сесія. За якасную падрыхтоўку да яе змагаецца ўвесь універсітэцкі калектыў. Значную ролю ў гэтай падрыхтоўцы павінны адыграць насценныя газеты. На іх старонках патрэбна з нумару ў нумар друкаваць матэрыялы аб ходзе падрыхтоўкі да сесіі, аб росце ўзроўню ведаў студэнтаў. Прапагандуючы вопыт самастойнай вучобы лепшых студэнтаў, нельга абыходзіць маўчаннем ні аднаго дрэннага адказу на семінарах, ні аднаго пропуску заняткаў без уважлівых прычын, ні аднаго зрыву лекцый.

Толькі праводзячы адзіную, мэтанакіраваную лінію ў асвятленні вучэбнага працэсу, расказваючы аб перадавым, смела і прынцыпова выкрываючы адмоўнае, насценныя газеты выканаюць свой галоўны абавязак і стануць сапраўднымі памочнікамі грамадскіх арганізацый у барацьбе за высокую якасць вучэбнай і навуковай работы.

ВЕЧАР ПАМЯЦІ С. І. ВАВІЛАВА

Нядаўна адбылася навуковая канферэнцыя, прысвечаная памяці акадэміка С. І. Вавілава.

Клуб універсітэта запоўнілі студэнты, аспіранты і навуковыя супрацоўнікі фізіка-матэматычнага факультэта.

Змястоўны даклад «Аб жыцці і дзейнасці С. І. Вавілава» зрабіў вучань С. І. Вавілава, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар А. Н. Сеўчанка. Дакладчык ахарактарызаваў пакойнага акадэміка як выдатнага вучонага і грамадскага дзеяча і расказаў аб яго ролі ў развіцці совецкай навукі.

Вялікую цікавасць выклікаў даклад доктара фізіка-матэматычных навук прафесара Б. І. Сцяпанава на тэму: «Працы С. І. Вавілава па люменістэнцыі» і даклад загадчыка кафедры тэарэтычнай фізікі дацэнта Ф. І. Фёдарава «Філасофскія працы С. І. Вавілава». Дакладчыкам быў зададзен рад пытанняў, на якія ўдзельнікі канферэнцыі атрымалі вычарпальныя адказы. Затым прафесар А. Н. Сеўчанка падзяліўся сваімі ўспамінамі аб сумеснай працы з С. І. Вавілавым.

У заключэнне ўдзельнікам канферэнцыі быў паказан дакументальны фільм аб жыцці і дзейнасці С. І. Вавілава.

М. К. ШЫДЛОЎСКІ,
в. а. загадчыка кафедры электра-фізікі.

Ва універсітэтах і інстытутах краіны

ПА СТАРОНКАХ ШМАТТЫРАЖНЫХ ГАЗЕТ

ДАПАМОГА ВЫТВОРЧАСЦІ

Вялікую дапамогу вытворчасці па вывучэнню прыродных рэсурсаў рэспублікі аказваюць студэнты геолага-геаграфічнага факультэта. У гэтым годзе яны даследвалі вадаёмы ў раёнах асваення новых зямель. Другакурснікі геаграфічнага аддзялення займаліся комплексным даследваннем азёр у Кушмурыскім і Сяміазёрным раёнах Кустанайскай вобласці. Яны выканалі вялікую колькасць морфаметрычных работ па даследванню аб'ёму водных мас азёр, іх глыбіні, плошчаў, вывучылі хімічны склад вады і ўмовы развядзення рыбы ў гэтых вадаёмах. Даныя даследвання будуць шырока выкарыстаны Міністэрствам соўгасаў КазССР для вырашэння праблем водазабяспечання ў месцах, дзе ствараюцца зараз новыя соўгасы.

Студэнты III курса геаграфічнага аддзялення прарабілі значную работу па даследванню грунтовых вод на тэрыторыі соўгасаў Акцюбінскай і Семіпалацінскай абласцей.

Студэнты III і IV курсаў геалагічнага аддзялення, якія працавалі ў геалагічных атрадах і партыях Казгеолагаўпраўлення і аб'яднання «Казахстаннафта», даследвалі геалагічную будову новых месцанараджэнняў карысных выкапняў.

«За отличную учебу».
Казахскі універсітэт імя С. М. КІРАВА.

КУЛЬТПАХОД У МУЗЕЙ

На днях студэнты першага курса аддзялення журналістыкі арганізавалі культпаход у музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Яны пазнаёміліся з дакументамі, якія расказваюць аб гераічнай барацьбе совецкага народа ў гады вайны. З цікавасцю разглядалі студэнты экспанаты—сведкі выдатных подзвігаў беларускіх партызан, падоўгу заставаліся каля тых, якія расказваюць аб абаронцах Брэсцкай крэпасці, аб барацьбе совецкіх людзей у тылу ворага.

У кнізе водгукаў студэнты пакінулі такі запіс:

«Мы ніколі не забудзем бяссмертных подзвігаў Зоі Касмадзем'янскай, Нікалая Гастэла, Віктара Талаліхіна, краснадонцаў і іншых герояў, якія загінулі ў баях за Радзіму. Іх жыццё—прыклад для совецкай моладзі ў яе барацьбе за мір, за комунізм».

І. ШУЦІК,
студэнт I-га курса аддзялення журналістыкі.

1200 ВІДАЎ РАСЛІН

Калектыў работнікаў батанічнай станцыі за некалькі год сабраў калекцыю розных раслін у 1200 відах.

Супрацоўнікамі станцыі праводзіцца работа па ўкараненню ў калгасы вобласці такіх эфіра-маслічных культур як парэзнік, гладыш, ірыс, лаванда, казанлыкская ружа, чубушнік і інш.

З калгасаў вобласці станцыя атрымоўвае вялікую колькасць запросаў аб высылцы ўзораў рознага насення кармавых траў, дэкаратыўных і іншых раслін, якія калекцыямі пасылаюцца ў вёску.

Кожнае лета батанічную станцыю наведваюць экскурсанты з калгасаў, МТС і соўгасаў. У кнізе запісаў яны пакідаюць станоўчыя водгукі.

«За кадры».
Варонежскі сельскагаспадарчы інстытут.

Прэмія часопіса „Сусветныя студэнцкія навіны"

У пачатку года рэдакцыя журнала «Сусветныя студэнцкія навіны» запрасіла ўсіх студэнтаў свету прыняць удзел у трэцім конкурсе журнала на лепшае кароткае апавяданне ці нарыс, паэму або драматычны твор, фотаздымак, малюнак або карыкатуру, адлюстроўваючыя ўсе бакі дзейнасці студэнтаў. Ужо падведзены і апублікаваны вынікі гэтага конкурса («Сусветныя студэнцкія навіны», № 8—9 за жнівень—верасень 1954 г.). Усяго прэміравана 23 работы, з якіх дзве з Совецкага Саюза. Другой прэміі удастоена серыя фотаздымкаў, якія прыслаў Джангір Эфендзіеў, студэнт IV курса юрыдычнага факультэта нашага універсітэта. Па ўмовах конкурса Д. Эфендзіеў павінен атрымаць набор для рысавання, а таксама альбом грампласцінак або серыю кніг.

«За ленинское воспитание».
Азербайджанскі дзяржаўны універсітэт імя С. М. КІРАВА.

КАБІНЕТ ФАНЕТЫКІ

Вялікую дапамогу ў вывучэнні замежных моў аказвае студэнтам філалагічнага факультэта кабінет фанетыкі. Ён мае навейшую гуказапісваючую апаратуру, схемы і дыяграмы, макеты галасавога апарата. Усё гэта дае магчымасць праводзіць карысныя практычныя заняткі па правільнаму вымаўленню. Для студэнтаў рэгулярна арганізоўваюцца кансультацыі па агульнаму мовазнаўству і фанетыцы.

Спецыяльная апаратура дае магчымасць збіраць каштоўную калекцыю запісу моў свету: індыйскай, кітайскай, негрыцянскай і многіх іншых.

«За радянські кадри».
Кіеўскі дзяржаўны універсітэт імя Т. Г. ШЭЎЧЭНКА.

СТУДЭНЦКІ ЛЕКТОРЫЙ

Дакладам аб міжнародным становішчы пачаў сваю работу лекторый філалагічнага факультэта. Тут распрацавана цікавая змястоўная тэматыка, да чытання лекцый прыцягнута шырокае кола выкладчыкаў.

У бліжэйшы час адбудзецца сустрэча з пісьменнікамі Масквы, сустрэча з удзельнікам Абухаўскай абароны і рэвалюцыі 1905 года рабочым М. Г. Крэзавым.

Лекцыі чытаюцца па аўторках у Актавай зале факультэта.

«Ленинградский университет».
Ленінградскі ордэна Леніна дзяржаўны універсітэт імя А. А. ЖДАНАВА.

Японскія госці ў інстытуце

Днямі ў інстытуце пабывала японская профсаюзная дэлегацыя, якая гасціла ў СССР па запрашэнню ВЦСПС.

Асаблівую цікавасць праявілі члены дэлегацыі да арганізацыі работы на факультэце народаў Крайняй Поўначы. Дырэктар інстытута А. І. Шчарбакоў падрабязна расказаў гасцям аб структуры факультэта, аб арганізацыі вучэбнага працэсу на ім, аб спецыфіцы падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў для школ Совецкай Поўначы.

Затым члены дэлегацыі пабывалі на факультэце народаў Крайняй Поўначы. Выступаючы перад студэнтамі з Поўначы і студэнтамі другіх факультэтаў, старшыня дэлегацыі заявіў аб рашучасці рабочых Японіі прадухіліць новую вайну і жыць у міры і дружбе з совецкім народам і іншымі народамі свету.

Пасля азнаямлення з заняткамі на геаграфічным і іншых факультэтах госці з вялікай цікавасцю прагледзелі дэманстраваўшыяся ў гэты час у кіноаўдыторыі каляровыя кінофільмы.

«Советский учитель».
Ленінградскі педагагічны інстытут.

КОМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

КОМСАМОЛЬСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ СТУДЭНТАЎ

Палітыка-выхаваўчая работа сярод студэнтаў у многім залежыць ад таго, як гэтаму ўдзяляюць увагу комсамольскія факультэцкія ці аддзяленчаскія арганізацыі, як яны цікавяцца становішчам вучобы, дысцыпліны і быту студэнтаў.

Комсамольская арганізацыя аддзялення журналістыкі настойліва змагаецца за павышэнне якасці вучобы студэнтаў, за павышэнне іх ідэйнага, палітычнага і культурнага ўзроўню.

Асабліва вялікая ўвага ўдзяляецца першаму курсу. Большасць першакурснікаў прышлі ва універсітэт са школьнай парты і таму не былі знаёмы з арганізацыяй, метадамі работы і вучобы ў ВНУ. Комсамольскае бюро аддзялення ў першыя-ж дні заняткаў рашыла правесці сход, на якім выдатнікі вучобы старэйшых курсаў падзяліліся вопытам сваёй работы і вучобы з маладымі таварышамі. Гэта прынесла жаданыя вынікі за выключэннем асобных выпадкаў, калі на курсе знайшліся комсамольцы, рашыўшыя, што наведванне лекцый, вядзенне канспектаў і выкананне грамадскіх даручэнняў для іх неабавязкова. Многія выкладчыкі скардзіліся на недысцыплінаванасць такіх студэнтаў, як Фралоў, Пераверзева, Булгакова. Адразу-ж быў скліканы комсамольскі сход, на якім студэнты абмеркавалі і асудзілі несур'ёзныя адносіны комсамольцаў да вучобы. На гэтым-жа сходзе комсамольцы падверглі справядлівай і прынцыповай крытыцы і членаў комсамольскага бюро курса, якія яшчэ слаба рэагуюць і не прымаюць мер да недастойных учынкаў студэнтаў. На гэтым-жа курсе намечана правесці сход на тэму: «Аб слаўных традыцыях комсамола універсітэта».

Першыя-ж месяцы вучобы ў гэтым годзе паказваюць, што асабліва дрэнна абстаяць справы з наведваннем і дысцыплінай на III курсе (комсорг тав. Гаворка). Многія комсамольцы гэтага курса дзейнічаюць па прынцыпу: «мая хата з краю». Нават сам праворг курса тав. Рапацэвіч зусім безадказна адносіцца да выканання грамадскіх даручэнняў. Ён сам не прымаў удзел ва ўборцы бульбы, калі ўвесь курс ездзіў дапамагаць калгасам, не з'яўляецца на суботнікі, прапускае заняткі.

Невыпадковым з'яўляецца той факт, што іменна на гэтым курсе знайшоўся «смяльчак» у асобе студэнта Балаша, які з трыбуны прафсаюзнага сходу аддзялення журналістыкі заявіў, што на лекцыі ён не хадзіў і не збіраецца хадзіць. Усё гэта сведчыць аб слабай палітыка-выхаваўчай рабоце на III курсе. Мала зрабіла для выпраўлення такога становішча і комсамольскае бюро аддзялення.

На другім курсе самай звычайнай з'явай сталі пропускі лекцый, у той час як у мінулым годзе кожны пропуск абмяркоўваўся ўсім калектывам курса. Тым больш гэта недаравальна, што з ліку студэнтаў курса ў гэтым годзе абраны ў кіруючыя органы грамадскіх арганізацый універсітэта многія комсамольцы і камуністы. Выконваючы, безумоўна, вялікую грамадскую работу, яны не заўважаюць, што робіцца на іхнім-жа курсе. Нават больш таго, часта самі прапускаюць лекцыі.

Рашэннем партыйнага бюро універсітэта ў гэтым годзе адменена правядзенне палітінфармацый. Гэта развязвае ініцыятыву комсамольскіх груп, дае ім магчымасць сваімі сіламі праводзіць гутаркі і даклады на тэмы, больш блізкія для студэнтаў.

Комсамольскае бюро аддзялення рашыла праводзіць на кожным курсе такія даклады не радзей двух разоў у месяц. Аднак гэтае рашэнне выконваецца далёка не на ўсіх курсах. На пятым курсе, напрыклад, яшчэ не прачытана ніводнага даклада на палітычную тэму (сакратар комсамольскага бюро курса Г. Чэлышава). Адказны за палітыка-выхаваўчы сектар комуніст т. Каленчыц недастаткова патрабуе ад комсоргаў рэгулярнага правядзення такіх дакладаў і гутарак, а сакратары комсамольскіх груп самі не праяўляюць ініцыятывы і чакаюць абавязкова ўказанняў «зверху».

На аддзяленні ёсць лектарская група з 17 комсамольцаў. Яны чытаюць даклады і лекцыі на падшэфных прадпрыемствах. Але комсамольскае бюро недастаткова займаецца падрыхтоўкай дакладчыкаў і не кантралюе іх работу. У выніку дакладчыкі прадстаўлены самі сабе. Гэта прыводзіць да таго, што некаторыя з іх, як Краснеўская, Міхаленка, за апошні час не падрыхтавалі ніводнага даклада.

Нельга не адзначыць, што ў гэтым годзе на аддзяленні працуюць у больш цесным кантакце комсамольская і прафсаюзная арганізацыі. Аднак часам адна арганізацыя, спадзяючыся на другую, выпускае з поля зроку якое-небудзь важнае пытанне. Напрыклад, ні комсамольскае, ні прафсаюзнае бюро да гэтага часу не пацікавілася, як жывуць студэнты аддзялення ў інтэрнатах, чым займаюцца яны ў вольны час. А тут якраз не ўсё абстаіць добра.

Недастатковую дапамогу комсамольскай арганізацыі аказвае і партыйнае бюро факультэта. Калі ў мінулым годзе за кожным курсам былі зацверджаны адказныя з ліку выкладчыкаў, якія хоць зрэдку бывалі на курсах пасля лекцый і на комсамольскіх сходах, то сёлета студэнты бачаць выкладчыкаў толькі на лекцыях.

Комсамольская арганізацыя здольна і павінна палепшыць палітыка-выхаваўчую работу на аддзяленні. У гэтым павінна аказаць ёй дапамогу і партыйная арганізацыя. Партыйны сход філалагічнага факультэта заслухаў даклад сакратара комсамольскага бюро аддзялення журналістыкі, намеціў мерапрыемствы па ліквідацыі недахопаў у гэтай справе. Трэба чакаць, што гэта дасць жаданыя вынікі, павысіць узровень палітычнага выхавання студэнтаў.

Д. ГАЛКІН.

Накіраваць работу дыпломнікаў

Падрыхтоўка дыпломнай работы—завяршальны этап у авалодванні спецыяльнасцю, гэта сур'ёзная праверка ведаў студэнтаў, праверка таго, наколькі ён засвоіў асноўныя прынцыпы навуковага даследвання. І таму як студэнт-пяцікурснік, так і яго кіраўнік павінны аднесціся да работы з усёй сур'ёзнасцю і адказнасцю.

Гэта добра зразумеў калектыў студэнтаў і выкладчыкаў геолага-геаграфічнага факультэта. У аснову даследванняў дыпломнікаў тут пакладзены матэрыялы летняй практыкі. Усе пяцікурснікі ўжо здалі справаздачы аб практыцы, якія ў будучым з'явяцца касцяком дыпломных работ. Паспяхова працуюць над сваімі тэмамі В. Курмянскі, Л. Булгакова, Н. Асноўская і З. Альфер. У іх справаздачах, якія прысвечаны эканамічнай або фізіка-геаграфічнай характарыстыцы раёнаў БССР ці асобнага калгаса, ёсць многа карысных для народнай гаспадаркі прапаноў. Выкладчыкі факультэта рэгулярна дапамагаюць дыпламантам. Дацэнт Н. Я. Грынблат часта кансультуе студэнта Г. Цвяткова, які працуе над этнаграфічным нарысам аб калгасным жыцці Багушэўскага раёна Віцебскай вобласці. Сістэматычна праводзяць кансультацыі выкладчыкі В. А. Дземянц'еў, Н. Е. Рагозін і О. Ф. Якушка.

Вопыт паказвае, што найбольш каштоўнымі з'яўляюцца тыя дыпломныя даследванні, якія выраслі з курсавых работ або дакладаў у навуковых гуртках. Калі студэнт працуе над тэмай з трэцяга—чацвертага курсаў, ён мае магчымасць здаць работу датэрмінова. Так і зрабіў студэнт 5-га курса аддзялення філасофіі А. Самаль. У мінулым навучальным годзе ў гуртку ён распрацаваў тэму аб светапоглядзе дзекабрыста Якушкіна, і цяпер засталася толькі паглыбіць і распрацаваць асобныя месцы. Дыпломныя даследванні М. Бяссмертнай (II курс аддзялення біялогіі) у сваёй аснове таксама маюць дыпломныя або курсавыя работы.

Абарона дыпломных работ не за гарамі. І таму нашы грамадскія арганізацыі павінны цікавіцца работай кожнага дыпламанта. Так і робіцца на V курсе аддзялення фізікі. Групорг Э. Гіцэвіч і праворг Л. Завадзкі штодзённа сочаць, ці сістэматычна працуюць над дыпломнымі іх аднакурснікі. Выкладчыкі І. Г. Некрашэвіч, Ф. І. Федараў, Л. А. Барысаглебскі і А. Е. Турэцкі не чакаюць, пакуль студэнты самі прыдуць на кансультацыю, а сістэматычна выклікаюць іх да сябе. Трэба, каб на такі шлях сталі ўсе кіраўнікі дыпломных работ нашага універсітэта.

Павінен выклікаць трывогу той факт, што кіраўнікі ёсць не ва ўсіх дыпламантаў. Згодна з заявай дэкана гістарычнага факультэта тав. Сідарэнка, па віне кафедры асноў марксізма-ленінізма і гісторыі філасофіі некаторыя студэнты V курса аддзялення фізікі засталіся без кіраўнікоў. Не паклапацілася аб дыпламантах завочнага аддзялення і кафедра гісторыі рускай літаратуры.

— Дыпломнікі нас бамбардуюць пісьмамі,—гаворыць намеснік дэкана завочнага аддзялення П. Г. Скапцоў,—а мы не можам ім адказаць, хто іх кіраўнік, да каго звяртацца за кансультацыямі.

Яшчэ не ўсім дыпламантам забяспечаны добрыя ўмовы для паспяховай работы. Некаторыя студэнты V курса аддзялення матэматыкі не маюць неабходнай літаратуры па дыферэнцыяльнай геаметрыі.

У пяцікурснікаў аддзялення біялогіі Т. Малчанавай і А. Бандарчук няма пастаяннага месца для лабараторных работ.

Гэтыя недахопы павінны быць ў бліжэйшы час выпраўлены з тым, каб кожны пяцікурснік змог паспяхова і ў тэрмін абараніць сваю дыпломную работу.

А. МАЛЬДЗІС.

КОЖНЫ КОМСАМОЛЕЦ—ВАЯЎНІЧЫ АТЭІСТ

Марксісцкі погляд на свет, на жыццё, на развіццё прыроды і грамадства абапіраецца на непарушны фундамент трывалых ведаў, на гранітныя асновы перадавой матэрыялістычнай навукі. Сацыялістычная ідэалогія канчаткова і безраздзельна пануе ў нашай краіне. Яна зацвердзілася і перамагла разам з ліквідацыяй старога грамадства, разам з пабудовай сацыялізма ў СССР. Гэтая ідэалогія несумяшчальна ні з якой папоўшчынай, ні з якімі забабонамі.

Асноўныя корані рэлігіі ў эксплуататарскім грамадстве, у тым ліку і сучасным капіталістычным,—вучыць марксізм,—сацыяльныя. Яны заключаюцца ў страшэннай прыдушанасці працоўных эксплуатацыяй і, як здаецца працоўным, у поўным іх бяссіллі перад стыхійнымі сіламі капіталізма, перад эксплуататарамі. З ліквідацыяй эксплуататарскіх класаў у нашай краіне зніклі корані, якія жывяць рэлігію. Аднак неражыткі старой буржуазнай ідэалогіі, у тым ліку і рэлігійнай, усё яшчэ напамінаюць аб сабе і да гэтага часу, працягваюць атручваць свядомасць часткі совецкіх людзей.

Комуністычная партыя, выхоўваючы ўсіх совецкіх людзей у духу навуковага светапогляду, заўсёды праводзіла і праводзіць непрымірымую ідэйную барацьбу з рэлігіяй, як антынавуковай ідэалогіяй. «Калі ў адносінах да дзяржавы рэлігія з'яўляецца прыватнай справай і па гэтаму царква адлучана ад дзяржавы,—указваецца ў пастанове ЦК КПСС ад 10 лістапада 1954 года,—то Комуністычная партыя, абапіраючыся на адзіна правільны навуковы светапогляд — марксізм-ленінізм і яго тэарэтычную аснову—дыялектычны матэрыялізм,—не можа абыякава, нейтральна адносіцца да рэлігіі, як ідэалогіі, нічога агульнага не маючай з навукай».

Навукова-атэістычная прапаганда, якую праводзіць наша партыя, з'яўляецца састаўной часткай комуністычнага выхавання працоўных. Яна мае сваёй мэтай пашырэнне навуковых, матэрыялістычных ведаў у масах, паказ беспадстаўнасці, антынавуковасці рэлігійных догм, вызваленне такім шляхам веруючых людзей з-пад уплыву рэлігійных забабонаў. ЦК КПСС у сваёй Пастанове з усёй сілай яшчэ раз падкрэслівае, што мэта нашай антырэлігійнай прапаганды ў сучасных умовах—гэта ідэалагічная барацьба навуковага, матэрыялістычнага светапогляду супроць антынавуковага рэлігійнага светапогляду.

Вялікую дапамогу партыйнай арганізацыі ў справе далейшага пашырэння навукова-атэістычнай прапаганды можа і павінна аказаць вялікая армія нашага студэнцтва, комсамольская арганізацыя універсітэта. Статут ВЛКСМ абавязвае кожнага комсамольца актыўна праводзіць барацьбу супроць рэлігійных забабонаў.

Студэнты прыродаведчых і гуманітарных факультэтаў глыбока вывучаюць асновы і дасягненні сучаснай навукі, яны ўзбройваюцца марксісцка-ленінскім светапоглядам. Задачы нашых комсамольцаў, асабліва старэйшых курсаў, у тым і заключаюцца, каб несці навуковыя веды ў масы, распаўсюджваць іх, дапамагчы вызваліцца тым, хто верыць, з-пад рэлігійнага дурману. Ры гэтым заўсёды неабходна памятаць указанні партыі, што барацьба з рэлігіяй ёсць барацьба ідэалагічная, што тут недапусцімы абразы і выпады супроць веруючых і служыцеляў культу.

Каму, як ні студэнтам-комсамольцам, лягчэй за ўсё паказаць у гутарках і дакладах супроцьстаўленне навукі і рэлігіі, растлумачыць, што калі навука абапіраецца на факты з жыцця, на навуковыя эксперыменты і на вывады, якія праверaны і строга падцверджаны на практыцы, то любая рэлігія абапіраецца толькі на біблейскія і іншыя паданні, на фантастычныя выдумкі першабытных людзей. Неабходна паказваць, што навука дапамагае чалавеку ўсё глыбей і глыбей пазнаваць аб'ектыўныя законы развіцця прыроды і грамадства, прымушае прыроду служыць на карысць чалавека. У гэты-ж час патрэбна на канкрэтным разборы рэлігійных догм аб стварэнні зямлі і чалавека паказаць, што рэлігія затуманьвае свядомасць чалавека, навязвае яму ілжывае, недарэчнае прадстаўленне аб свету, чым скоўвае яго творчую актыўнасць і ініцыятыву.

Асабліва вялікую работу па прапагандзе навуковага атэізма студэнты могуць і павінны праводзіць у час канікулаў, калі яны раз'язджаюцца па вёсках, дзе яшчэ востра адчуваецца недахоп у кваліфікаваных кадрах антырэлігійных прапагандыстаў.

У гэтай сувязі неабходна адзначыць, што нашы кафедры грамадскіх навук, асабліва прыродаведчых, яшчэ недастаткова ўвагі ўдзяляюць такому важнаму пытанню, як дапамога студэнтам у набыцці навыкаў вядзення навукова-атэістычнай прапаганды. Нярэдка бываюць выпадкі, што студэнт-прапагандыст засвойвае правільнае матэрыялістычнае разуменне таго ці іншага пытання, але ён незнаём з рэлігійным, ідэалістычным яго тлумачэннем і пагэтаму аказваецца няздольным, няпоўнацэнным барацьбітом з рэлігіяй. Кафедрам неабходна сур'ёзна прадумаць і намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па ўвязванню ў лекцыйных курсах і практычных занятках пытанняў навуковага атэізма з тым, каб узброіць наша студэнцтва разуменнем задач, якія стаяць у вобласці антырэлігійнай прапаганды і ўменнем правільна і дзейсна праводзіць гэтую прапаганду.

Наш вялікі калектыў навуковых работнікаў і студэнтаў можа вельмі многае зрабіць у барацьбе за канчатковае пераадоленне рэлігійных перажыткаў у свядомасці людзей. У гэтым і павінны аказаць вялікую дапамогу комсамольцам-прапагандыстам партыйныя і комсамольскія арганізацыі факультэтаў.

В. СІКОРСКІ,
кандыдат філасофскіх навук.

За творчую работу СНТ

Сярод вышэйшых навучальных устаноў горада Мінска шырока вядома сваімі дасягненнямі студэнцкае навуковае таварыства нашага універсітэта. У 1953—54 навучальным годзе яно дасягнула значных поспехаў і ў трэці раз заняло першае месца на гарадскім аглядзе студэнцкіх навуковых работ.

На справаздачным сходзе універсітэцкага СНТ, які адбыўся нядаўна, былі падведзены вынікі работы таварыства за мінулы год. Старшыня совета СНТ А. Самускевіч у справаздачным дакладзе адзначыў, што асноўнай формай дзейнасці навуковага таварыства была гуртковая работа. Колькасць навуковых гурткоў узрасла з 57 у 1952—53 навучальным годзе да 65 у 1953—1954 г. У іх удзельнічала каля 1000 студэнтаў. Да кіраўніцтва даследчай работай студэнтаў прыцягнуты лепшыя сілы універсітэта: 19 прафесараў, 56 дацэнтаў і кандыдатаў навук, 5 выкладчыкаў і асістэнтаў. Многія з іх сумелі прывіць студэнтам любоў да навукі. Плённай і цікавай была работа ў гуртку гідрабіялогіі і энтамалогіі пад кіраўніцтвам прафесара Г. Г. Вінберга. Да лепшых адносяцца і гурткі гісторыі рускай філасофіі (кіраўнік прафесар І. Н. Лушчыцкі), дыялектычнага матэрыялізма (дацэнт В. І. Сцяпанаў), сучаснай беларускай мовы (дацэнт М. І. Жыркевіч), замежнай літаратуры (дацэнт Д. Е. Фактаровіч) і многія іншыя.

Умелая пастаноўка работы ў гуртках садзейнічала творчаму росту іх удзельнікаў. Аб гэтым сведчыць гарадскі агляд студэнцкіх навукова-даследчых работ. На аглядзе было прадстаўлена 183 работы. З іх 156 работ аднесены да першай і другой катэгорый. Лепшымі з'яўляюцца даследванні студэнтаў Е. Паповіч, В. Кашэўскай, Н. Цветковай, Е. Камароўскага і другіх.

Аднак нараду з нямалымі поспехамі ў рабоце СНТ маюцца яшчэ сур'ёзныя недахопы.

На сходзе адзначалася, што дрэнна працавалі на працягу навучальнага года гурткі рускай фразеалогіі (кіраўнік—кандыдат філалагічных навук т. Базыленка), рускай мовы (дацэнт т. Бірала), матэматычнага аналізу (дацэнт т. Лямбін). Бяздзейнічалі гурткі тэарэтычнай механікі (кіраўнікі—дацэнты тт. Халімановіч і Пахута).

Выступіўшы ў спрэчках старшыня совета СНТ філалагічнага факультэта І. Пісарэнка прызнаў, што і ў новым навучальным годзе многа навуковых гурткоў знаходзяцца яшчэ ў стадыі раскачкі і работу не пачыналі. Ён адзначыў, што многія студэнты толькі фармальна лічацца ўдзельнікамі гурткоў; за доўгі час яны не выканалі ніводнай работы. Аб гэтым сведчыць той факт, што за мінулы навучальны год у гуртках універсітэта заслухана ўсяго 398 дакладаў. Адсутнасць кантролю прывяла да таго, што совет СНТ і яго старшыня А. Самускевіч не ведаюць, чым займаліся астатнія 600 студэнтаў.

Такая неарганізаванасць тлумачыцца слабым кантактам у рабоце паміж советам СНТ, кафедрамі, выкладчыкамі і грамадскімі арганізацыямі універсітэта. Многія кіраўнікі гурткоў лічаць лішнім займацца арганізацыйнай работай у гуртках. Камітэт комсамола і прафком абмяжоўваюць свае адносіны да навукова-даследчай работы ўсяго толькі зборам фактаў.

На сходзе ўказвалася, што ва універсітэце мала цікавяцца лёсам работ, якія прадстаўляюцца на гарадскія агляды. Дацэнт т. Фішэр прывёў такі прыклад: у мінулым годзе на гарадскім аглядзе былі адхілены работы студэнтаў А. Крыпскага і Л. Казачэнка толькі на той падставе, што яны з'яўляюцца дыпломнымі. Між тым, першая работа ўкаранёна на Мінскім трактарным заводзе, а другая прынята для надрукавання рэдакцыяй часопіса «Известия Академии наук СССР».

Сход абраў новы склад совета СНТ у колькасці 9 чалавек. Старшынёй совета абраны аспірант В. Нядзелька.

А. ЗАХАРЭНКА.

ФЕЛЬЕТОН

КАЛІ МІНУЛА ДВАНАЦЦАЦЬ...

— Хлопцы, пусціце...—у голасе просьба і стрыманая пагроза. Але з-за дзвярэй пакоя № 114 інтэрната па вуліцы Свердлова даносіцца з'едлівы смех.

— Пусціце! Да д'ябла гэткія жарты!—юнак пачынае выходзіць з роўнавагі і нервозна ірве дзвярную ручку. — А то выламаю дзверы...

Ры гэтых словах смех у пакоі пераходзіць у гамерычны рогат, ад якога дрыжаць шыбы ў вокнах і які палохае нават самых уроўнаважаных асоб інтэрната. А юнак, пераступаючы па падлозе босымі нагамі і ляскаючы зубамі ад холаду, зноў грукае ў дзверы.

— Чаго глоткі дзярэце? Адкрывайце!

З дзвярэй суседніх пакояў выязяць здзіўленыя заспаныя твары.

— Вы з глузду з'ехалі, ці што?

— Яшчэ пухам не наабрасталі, а ўжо на галовах ходзяць...

— Ай да першакурснікі! Ну і дурні!—чуецца з усіх бакоў. Амаль увесь чацверты паверх на нагах.

Расчырванелы студэнт першага курса геолага-геаграфічнага факультэта Ф. Дрык сарамліва ціснецца да вушняка. У вачах яго слёзы, крыўда на сваіх таварышаў Савіцкага, Тарасіна, Хаценчыка, якія дзеля «забавы» выкінулі яго ў калідор, захлопнуўшы дзверы на ключ. Ім смешна, як іх сябра нервуе. Толькі не да смеху жыхарам суседніх пакояў: хуліганы парушылі іх адпачынак. Самі-ж «жартаўнікі» раніцой праспяць першыя лекцыі.

Але неспакойна не толькі на чацвертым паверсе. На трэцім, з пакоя № 73, чуваць праз лёскат даміно ўзрушаныя галасы студэнтаў П. Жарскага, Н. Дубіна, Е. Зубарава, Еўменава:

— Шэсць—адзін, тры—пяць!

І, нарэшце, ўрачысты голас Жарскага:

— Казлы, айда пад стол!

«Казлам» няма ніякай ахвоты сядзець пад сталом, дзе поўна акуркаў, але нічога не зробіш! І пад бурныя воплескі спачатку Дубін, а потым Зубараў пралазяць пад сталом на каленках.



Дзеля „забавы" яго выкінулі ў калідор...



—Казлы, айда пад стол.

—Даю туза,— крычыць Гусак.

—Бяздзельнік, хто з намі не п'е!

У студэнтаў пятага курса Гусака, Клюсава, Сычэўскага і Мушынскага (пакой № 78) ноч таксама праходзіць шумна: яны рэжуцца ў «тысячу». Зашмальцаваныя карты, якія можа доўгія гады служылі якой-небудзь бабульцы ў якасці аракулаў, аж зіхцяць у руках будучых педагогаў.

— Даю туза,—крычыць Гусак.— Падкідвайце, хлопцы, не шкадуйце. Пачакай, Клюсаў, ты што там махлюеш? У цябе-ж ёсць масць. Бач, вывучыўся...

— Што ты да мяне прычапіўся? — крыўдзіцца Клюсаў. — Ты-ж сам махляр добры.

Паверхам ніжэй таксама спяць не ўсе. Дзяўчаты суседніх пакояў былі-б рады заснуць, але такой магчымасці ім не дае радыёла, якая жудасна рабе ў начной цемры з пакоя № 38.

Радыёлу перакрыкваюць п'яныя жаночыя галасы:

— Бяздзельнік, хто з намі не п'е! Вып'ем, добрая сяброўка, сэрцу будзе весялей...

Гэта студэнткі V курса філалагічнага факультэта З. Роўба і В. Новік спраўляюць усю ноч імяніны сваёй сяброўкі Т. Гарановіч.

Дзяўчаты з суседніх пакояў можа ў дзесяты раз просяць развесяліўшыхся жыхароў пакоя № 38 супакоіцца.

— Падумаеш!—адказваюць тыя. —Мы тут апошні год жывем. Нам усё можна.

Агульнавядома, што ў інтэрнаце пасля 12 гадзін ночы павінен панаваць поўны спакой. Праз месяц з невялікім пачнецца зімовая экзаменацыйная сесія, у час якой павінен быць забяспечаны нармальны адпачынак студэнтаў. Дзеля гэтага трэба, каб у інтэрнаце быў устаноўлен патрэбны рэжым, а аматары начных «гульняў» стрымлівалі свае пачуцці ў інтарэсах калектыву.

Д. ГУСАКОЎ.

РЫХТАВАЦЬ СЯБЕ ДА НАВУКОВАЙ РАБОТЫ

Становішча з падрыхтоўкай студэнтаў-матэматыкаў да навуковай работы пастаўлена ў нашым універсітэце, на мой погляд, нездавальняюча. Прыводзімыя іншы раз фармальныя даныя аб ліку гурткоў і іх удзельніках могуць толькі ўвесці ў заблуджэнне, бо ў сапраўднасці творча займаюцца толькі лічаныя адзінкі. У выніку выпускнікі, нават лепшыя, аказваюцца вельмі слаба падрыхтаванымі да самастойнай навуковай працы, а набор і навучанне аспірантаў сутыкаюцца са значнымі цяжкасцямі. Многія дыпломнікі і аспіранты горка шкадуюць аб упушчаным імі часе. Усё гэта вельмі непрыемна пры не такім ужо слабым складзе студэнтаў аддзялення.

Сур'ёзна займацца, творча авалодваць навукай—такая задача стаіць перад намі. Вось чаму мы ўсе абавязаны ўнесці ў гэтую справу свой пасільны ўклад. З другога боку, хачу падкрэсліць, што такія заняткі—абавязак перад самім сабой: толькі тады жыццё можа стаць па-сапраўднаму цікавым, поўнацэнным.

Вядома, лепш за ўсё пачаць глыбокае вывучэнне навукі ўжо з першага курса. Аднак шматлікія прыклады паказваюць, што гэта зрабіць ніколі не позна, нават пасля заканчэння універсітэта. А студэнты, здольныя да глыбокай працы, на аддзяленні ёсць, але навуковай рабоце яны не ўдзяляюць увагі. Няправільна і шкодна таксама падманьваць і абязбройваць сябе і другіх «аб'ектыўнымі прычынамі»: недахопам часу або тым, што нібы ўжо позна пачынаць.

Для сур'ёзнай навуковай работы неабходны любоў і здольнасць да навукі. Усе гэтыя якасці могуць быць у далейшым значна развіты, але іх патрэбна развіваць з самага пачатку. І ўсё гэта павінна спалучацца з упартай працай, якая ператвараецца ў асноўную прывычку, патрэбу і радасць жыцця. Навуковы рост нямыслім без сістэматычнай мэтанакіраванай працы; маё асабістае веданне раду дзеячоў навукі паказвае, што ўсе яны без выключэння з'яўляліся адначасова людзьмі, якія працавалі значна больш другіх.

Падрыхтоўка да навуковай работы складаецца ў набыцці неабходных ведаў і навыкаў да элементарных самастойных даследванняў. Калі першае ў якімсьці аб'ёме дае ўніверсітэцкая праграма, то з другім справа абстаіць горш. Пагэтаму ў першую чаргу па важнасці для нас, матэматыкаў, трэба паставіць трэніроўку ў рашэнні задач павышанай цяжкасці (тыпа доказу тэарэм). Справа ў тым, што ў выніку проста добрасумленнага канспектавання і паўтарэння лекцый, рашэння заданых на дом задач і чытання, скажам, аднаго дакладу ў год на вузкую тэму, студэнт не будзе падрыхтаван да навуковай работы: тут неабходна значна большае.

Глыбокія веды набываюцца ў асноўным з кніг. Мяркую, што мэтазгодна чытаць кнігі (падручнікі ці іншую літаратуру) паслядоўна, гэта значыць, чытаць адну кнігу, пакуль не прачытаеш яе ўсю, або, ва ўсякім выпадку, значную яе частку; пры гэтым не трэба палохацца значна забегчы наперад у параўнанні з тым, што ў даны момант чытаецца на лекцыях. На першым этапе трэба чытаць кнігу падрад. Пры гэтым самае галоўнае—вывучэнне матэрыялу—павінна быць творчым і ініцыятыўным. Трэба аналізаваць доказы (якая ўмова дзе выкарыстана), імкнуцца будаваць прыклады на прыводзімыя азначэнні і тэарэмы, спрабаваць прыдумваць самому аналагічныя сцвярджэнні і даказваць іх, або абвяргаць пры дапамозе пабудавання прыкладаў. Іменна тут невычарпальная крыніца задач павышанай цяжкасці, якая падводзіць студэнта да навуковай работы. Іншы раз можна зрабіць так: прачытаўшы фармулёўку тэарэмы, спрабаваць яе даказаць, заглядваючы ў кнігу толькі пасля некалькіх дзён роздуму. Трэба прывыкнуць заўсёды думаць над такімі задачамі, абмяркоўваць іх з таварышамі і выкладчыкамі. На старэйшых курсах магчыма больш вузкая спецыялізацыя; тады найбольш мэтазгодна індывідуальная штодзённая работа выкладчыкаў са студэнтамі.

Усё гэта патрабуе, перш за ўсё, затраты большай колькасці часу. Трэба навучыцца з павагай адносіцца да ўласнага часу і часу таварышаў і не растрачваць сістэматычна, упустую, шматлікія гадзіны і дні. Патрэбна мець на ўвазе, што больш глыбокае вывучэнне аднаго прадмета зробіць значна лягчэйшай падрыхтоўку любога іншага. Неабходна дабіцца, каб вучэбная нагрузка студэнтаў (уключаючы ўсе віды аўдыторных заняткаў) не перавышала 36 гадзін у тыдзень. Нарэшце, я мяркую, што мэтазгодна зноў узняць перад Міністэрствам вышэйшай адукацыі пытанне аб прадастаўленні найбольш паспяхова працуючым студэнтам права вольнага наведвання заняткаў.

Студэнты павінны мець паміж сабой больш цесныя сувязі. Трэба размаўляць аб матэматыцы, даваць адзін другому задачы, прыдзірліва разбіраць рашэнні, садзейнічаць развіццю здаровага саперніцтва. У стварэнні такой навуковай атмасферы значную ролю павінна адыграць СНТ. Студэнты старэйшых курсаў могуць указаць малодшым літаратуру, задачы. Не трэба таксама палохацца «адымаць час» у выкладчыкаў: для кожнага выкладчыка крыўдным з'яўляецца не няведанне, а нежаданне ведаць, і ён часта толькі некалькімі словамі можа даць неабходныя ўказанні.

Трэба імкнуцца выкарыстоўваць усе магчымасці ў пашырэнні свайго навуковага і агульнага кругагляду—наведваць даклады, сачыць за часопісамі, набываць кнігі, не глядзець на сябе як на вузкага спецыяліста; у гэтым роля студэнцкага навуковага таварыства (СНТ) істотна.

У заключэнне яшчэ ўкажу на тую надзвычай важную акалічнасць, што навуковы работнік нямыслім без агульнага дастаткова высокага культурнага і палітычнага ўзроўню.

Прафесар А. Д. МЫШКІС.

А. Харкевич

ЗНАЕШЬ ЛИ ТЫ?

Знаешь ли ты,
девушка
с ласковым взглядом,
с полуколечками
русых волос,
что разрешить
нам
обязательно надо
наедине
очень важный вопрос?
Знаешь ли ты,
что
неспроста в коридоре
я избегаю
насмешек ребят?
Знаешь ли ты,
что
самым трепетным взором
я провожаю
украдкой тебя?
Знаешь ли ты,
что
по ночам мне не спится:
чудишься ты,
улыбаешься мне,—
и до утра
нервно
скрипят половицы
в такт моим мыслям
в ночной тишине?
Знаешь ли ты...
Может,
и знать не желаешь:
может, другой...
на примете давно?
Лучше всего,
если
ты просто не знаешь,
что разрешить это
нам суждено!

Г. Мохарт

РАСКАЖЫ, ДЗЯЎЧЫНА

Не сумуй, бяроза,
ў полі адзінокая,—
Не хачу хадзіць я
у журбе...
Раскажы, дзяўчына—
кветка сінявокая,
Ад чаго мне сумна
без цябе?
... Напаўнялі неба
крыкі жураўліныя—
Развіталася
і ты са мной...
Уразаўся поезд
у туманы сінія,
І ляцелі думкі
за табой.
Ты ідзеш, харошая,
ціхаю станіцаю,
А кругом
на ростанях-палях
Багацее лета,
шалясціць пшаніцамі,
Асядае сонца
ў каласах.
...Павуцінне белым
верасы пакрыліся,
Пажаўцела лета
на палях,—
А ў сэрцы думкі,
мары затаіліся—
І завуць, і просяцца
на шлях.
Не раняй, бяроза,
лісце адзінокае,
Як кусочкі
жнівеньскіх зарніц.
І хаця, дзяўчына,
ад цябе далёка я,
Ды маё каханне—
Без граніц.

ФЕСТЫВАЛЬ ПОЛЬСКІХ ФІЛЬМАЎ

З кожным годам мацнее дружба і культурная сувязь паміж працоўнымі Совецкага Саюза і Народнай Польшчы. Адным з доказаў гэтага з'яўляецца другі фестываль польскіх фільмаў, які пачаўся ў гарадах Саюза. Совецкія гледачы ўбачаць лепшыя кінокарціны польскай кінематаграфіі. Сярод фільмаў, якія будуць паказаны на фестывалі, ёсць і такія, якія ўжо атрымалі ў совецкага гледача высокую ацэнку.

Трэба адзначыць, што кіномастацтва ў буржуазнай Польшчы стаяла параўнаўча на нізкім узроўні, а лепшыя яго дасягненні былі знішчаны фашызмам. Пасля вызвалення Польшчы Совецкай Арміяй польская кінематаграфія пачала работу над першым фільмам. Гэта была цяжкая праца, бо праводзілася яна ў вельмі цяжкіх умовах. Але на экраны адзін за другім выходзяць фільмы: «Апошні этап», «Непакароны горад», «Забароненыя песенькі», «Начны ўзрыў», у якіх расказваецца аб барацьбе польскіх патрыётаў супроць гітлераўскіх захопнікаў. Нягледзячы на цяжкія ўмовы, у якіх ствараліся гэтыя фільмы, яны неаднаразова былі адзначаны прэміямі за іх ідэйна-мастацкія якасці. Напрыклад, фільм «Апошні этап» у пастаноўцы Ванды Якубоўскай атрымаў Вялікую прэмію на Міжнародным фестывалі ў 1948 годзе ў Марыянскіх Лазнях. Ужо гэтыя першыя фільмы сведчылі аб тым, што польская кінематаграфія ўступіла на шлях соцыялістычнага рэалізма.

З цягам часу польская кінематаграфія ўсё больш развіваецца. Яна выпускае ўсё больш і больш мастацкіх і дакументальных фільмаў, якія адзначаны шматлікімі прэміямі на міжнародных фестывалях.

Вялікую цікавасць выклікаў у гледача фільм «Дзве брыгады», у якім апяваецца мірная, свабодная праца. Перамога новага ў вёсцы паказана ў фільме «Абшчына». Гарадской і вясковай моладзі прысвечаны фільм «Першы старт». Аб будаўніках Варшавы апавядае кінокамедыя «Мой скарб». Дружба польскіх і чэшскіх пагранічнікаў паказана ў кінокарціне «Чортава цясніна». Польская кінематаграфія выпусціла гісторыка-біяграфічны фільм «Варшаўская прэм'ера», які расказвае аб гісторыі пастаноўкі першай польскай оперы кампазітара Манюшкі. Да гэткага-ж роду фільмаў можна аднесці і «Юнацтва Шапэна».

Заслугоўваюць увагі і дакументальныя фільмы аб жыцці новай Польшчы—«Пісьмо гарняка», «Маладая вёска» і іншыя.

Польская кінематаграфія смела ідзе наперад. Аб гэтым сведчаць новыя фільмы, якія ўбачылі совецкія гледачы на фестывалі. Адным з іх з'яўляецца «Дарогі жыцця» (рэжысёр Ежы Кавалеровіч) па матывах вядомага польскага пісьменніка Ігара Неверлі «Дзённік з фабрыкі «Цэлюлоза». Фільм расказвае аб беспрацоўі і галечы ў даваеннай буржуазна-панскай Польшчы, аб людзях, якія для таго, каб існаваць, павінны былі брацца за любую работу. Поўны драматызма кадры, адлюстроўваючыя забастоўку рабочых. Другім фільмам, які ўключан ў фестываль, з'яўляецца фільм «Выпадак на Марыенштаце» (рэжысёр Л. Бучкоўскі). Фільм паказвае будаўнікоў новай, соцыялістычнай Варшавы і ролю жанчыны ў новай Польшы. Галоўным героем гэтага фільма з'яўляецца вясковая дзяўчына Ганка Ручай, ролю якой выконвае маладая артыстка Л. Корсак, якая ўпершыню здымалася ў кіно.

Блізкі да яго па тэматыцы дакументальны фільм «Варшава» (рэжысёр Л. Перскі), які расказвае аб будаўніцтве польскай сталіцы.

Работнікі кінематаграфіі працуюць над шэрагам новых карцін, якія расказваюць аб выхаванні новага чалавека, аб барацьбе за мір і аб выкрыцці замежных агентаў.

Народная ўлада стварыла ўсе ўмовы для развіцця кінематаграфіі, якая павінна ўзбагаціць не толькі скарбніцу польскай, але і сусветнай культуры.

Э. ГЖОНДЗЕЛЯ,
студэнт IV курса філфака.

БЕРАГЧЫ СОЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ МАЁМАСЦЬ

Некалькі студэнтаў стаўпіліся каля каменданта інтэрната № 1 т. Ткачука.

— Сцяпан Прохаравіч, зрабіце ласку, замяніце паламанае крэсла...

— А нам, Сцяпан Прохаравіч, выдайце новы рэпрадуктар, а то наш сапсаваўся... Ды і, наогул, нікуды не годны ён!

Сцяпан Прохаравіч у здзіўленні разводзіць рукамі, затым сярдзіта дзёргае за вус:

— Таварышы, што-ж гэта атрымоўваецца? Я добра памятаю—у ваш пакой я выдаў зусім новае крэсла, а ў вас быў спраўны, як трэба, рэпрадуктар!..

Студэнты непрыкметна ўсміхаюцца: нічога, заменіць, важная рэч—крэсла ці рэпрадуктар, падумаеш...

З просьбай «замяніць» да каменданта звяртаюцца многія студэнты. Ры гэтым кожны з іх імкнецца запэўніць, што крэсла і іншая рэч «зламаліся самі». Такое ашуканства выклікае законнае абурэнне каменданта. Можна назваць цэлы рад пакояў, дзе за ўвесь час жыцця ў інтэрнаце студэнтамі не сапсавана ніводнай рэчы, беражліва захоўваецца мэбля. Гэта пакой № 90 (староста Паляшчук), пакой № 75 (ст. Русак), пакой № 111 (ст. Харлан) і многія іншыя. Узнікае пытанне, няўжо не змаглі-б зберагчы ад паломкі мэблю ў пакоі № 120 (староста Басякоў), дзе зусім нядаўна зламана два крэслы, ці ў пакоі № 92, дзе ўшчэнт разбіт рэпрадуктар? Вядома, можна. Трэба толькі больш беражліва і сумленна адносіцца да грамадскай маёмасці.

Як ні дзіўна, але на калідорах нярэдка можна бачыць нікчэмныя астанкі ад крэслаў—ножкі, спінкі і г. д. Яны валяюцца тут-жа пад дзвярыма пакояў, гаспадары якіх нават не патурбаваліся здаць паламаную мэблю каменданту інтэрната. Праверкай установлена, што ў многіх пакоях крэслаў нехапае па аднаму і больш, як, напрыклад, у № 66 і іншых.

Нярэдка ў дзень, калі абменьваецца пасцельная бялізна, можна пачуць наступную размову:

— Што гэта ў вас з абрусам? Парэзаны... Не, я такі не прыму,— рашуча гаворыць кастэляншa.— Хопіць ужо!

— Што вы, што вы?—пачынае апраўдвацца студэнт.—Ён-жа такі і быў! Прыміце, калі ласка...

Кастэляншa крыху раздумвае, затым, уздыхнуўшы, гаворыць:

— Так і быць, на гэты раз прыму, але ў наступны...

Такая непатрэбная тут чуласць кастэляншы прыводзіць да зусім нечаканых вынікаў. Сярод інтэрнацкіх абрусаў, якімі зараз карыстаюцца студэнты, амаль нельга знайсці цэлага. Прыкра тое, што нават дзяўчаты, якія-б, здаецца, павінны больш акуратна глядзець за чыстатой, прыносяць мяняць занадта брудныя абрусы (напрыклад, пакой № 56—староста Бразоўская).

Здараецца, што студэнты падварачваюць прасціны пад матрацы, у выніку чаго яны ржавеюць і рвуцца ад пружын.

Між тым на рамонт мэблі, замену шкла разбітых вокнаў, а таксама рамонт іншых рэчаў кожны месяц прыходзіцца расходваць вялікія сродкі. І не да твару студэнтам такая абыякавасць у адносінах да маёмасці, якой карыстаемся мы самі, якой будуць карыстацца студэнты пасля нас. Студсовету інтэрната патрэбна прыняць больш дзейсныя меры да студэнтаў, якія парушаюць правілы ўнутранага распарадку інтэрната, не захоўваюць соцыялістычную маёмасць.

Я. КАРШУКОЎ.

Фізкультура і спорт

КУБАК— У СПАРТСМЕНАК УНІВЕРСІТЭТА

Адбылася фінальная сустрэча на кубак ГК ЛКСМБ паміж валейбалісткамі універсітэта і інстытута народнай гаспадаркі. Трэба адзначыць, што з трох сяброўскіх сустрэч, якія адбыліся ў мінулым месяцы паміж гэтымі камандамі, дзве выйгралі спартсменкі інстытута.

Але да гэтага адказнага спаборніцтва каманда універсітэта прышла добра падрыхтаванай. І гэта ў першую чаргу заслуга трэнера каманды майстра спорту тав. Зумерграда. Радасна бачыць, што моц нашай каманды заключаецца перш за ўсё ў калектывізме, ва ўзаемаразуменні, у правільных тактычных замыслах і іх паспяховым выкананні.

Ацэньваючы гульню каманды універсітэта, цяжка сказаць, хто ў гэтым калектыве лепшы: усе шэсць ігракоў асноўнага складу каманды нядрэнна валодаюць моцнымі завяршаючымі ўдарамі, усе шэсць— паспяхова спраўляюцца з задачамі абароны; усе шэсць, як паказала апошняе спаборніцтва, у адказны момант самаддана змагаюцца за кожнае ачко, за кожную падачу.

На тактыцы каманды трэба спыніцца асобна. Амаль ні адна жаночая каманда горада не выкарыстоўвае завяршаючы ўдар з першага паса, бо такую тактыку можа ўжываць толькі каманда са значнай тэхнічнай падрыхтоўкай і тактычна правільным пабудаваннем гульні. Але трэнер каманды не пабаяўся ўжыць гэтую перадавую тактыку.

Н. Невядомская, І. Чэхоўская, Г. Захарава.



А. Рыбарава, Р. Ярымовіч, Л. Квач.

Для таго, каб каманда набыла вопыт у прымяненні гэтай тактыкі ў спаборніцтвах, тав. Зумерград стараўся праводзіць як мага больш сяброўскіх сустрэч з мацнейшымі камандамі горада. А для таго, каб каманда не мела прабелаў у тэхнічнай падрыхтоўцы, з пачатку кастрычніка трэніроўкі праводзіліся нават па два разы ў дзень.

І вось першы скромны вынік: нашы валейбалісткі заваявалі кубак ГК ЛКСМБ.

Прысутнічаўшыя на гэтай цікавай сустрэчы «балельшчыкі» кажуць, што фінал барацьбы за кубак прынёс ім мала задавальнення. Гэта на самой справе так: перавага валейбалістак універсітэта была настолькі відавочнай, што ўжо праз некалькі мінут пасля пачатку сустрэчы ніхто не сумняваўся ў перамозе нашай каманды.

Менш паспяхова выступала ў гэтых спаборніцтвах мужчынская каманда універсітэта. Пацярпеўшы паражэнне ад валейбалістаў Інстытута фізічнай культуры і спорту яна выбыла са спаборніцтваў. Але трэба адзначыць, што нашы валейбалісты ў сучасны момант непараўнальна мацнейшыя, чым гэта было ў мінулым годзе. Так, 12 лістапада яны перамаглі з лікам 3 : 2 каманду політэхнічнага інстытута, адну з мацнейшых у рэспубліцы. Гэта была трэцяя перамога, якую атрымалі нашы валейбалісты за апошнія пяць год над камандай політэхнічнага інстытута.

А. ГАРНАК.

Рэдактар В. Л. ШАЦІЛА.

АТ 10424 Мінск, друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Зак. 758